Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________________ С.Л. Шпарло
_____25.11._____2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД -489/эвуч.

# МУЗЫКА Ў ВІДОВІШЧЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-04 Мастацтва эстрады (рэжысура)*

2022

Вучэбная праграма складзена на падставе:
вучэбнага плану установы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-04 Мастацтва эстрады (рэжысура), рэг. № С17-1-18/21уч ад 22.07.2021;
Агульнаадукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12.04.2022 № 78 па спецыяльнасці 17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках);
вучэбнага плану установы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-04 Мастацтва эстрады (рэжысура), рэг. № С17-1-62/22уч ад 22.06.2022.

## СКЛАДАЛЬНІКІ

*Ю.Д. Пярсідская*, прарэктар па выхаваўчай рабоце ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства;
*Н.В. Петухова,* загадчык кафедры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

## РЭЦЭНЗЕНТЫ:

*І.А. Крывулька,* рэжысер-пастаноўшчык тэатрально-відовішчнай арганізацыі «Маладзежны тэатр эстрады»;
*І.А. Алексніна,* загадчык кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

## РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

*кафедрай рэжысуры* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 21.09.2022)
*прэзідыумам навукова-метадычнага савета* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 16.11.2022)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Музыка ў відовішчы» з'яўляецца адной з шэрагу вывучаемых спецыяльных дысцыплін для падрыхтоўцы студэнтаў у галіне эстраднага мастацтва. Дадзеная праграма складзена адпаведна адукацыйнага стандарта вышэйшай прафесійнай адукацыі Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці 1-17 01 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-17 01 03 01-04 Мастацтва эстрады (рэжысура). У рамках гэтай дысцыпліны здзяйсняецца падрыхтоўка грунтоўнай базы высокапрафесійных рэжысераў эстрады, якія здольны на сучасным узроўні ажыццяўляць рэжысерскую і педагагічную дзейнасць.

Дысцыпліна «Музыка ў відовішчы» цесна ўзаемазвязана з другімі дысцыплінамі прафесійнага цыклу – «Рэжысура эстрадных відовішчаў», «Асновы рэжысёрскай кампазіцыі», «Асновы сцэнічнага руху» і г.д.

Галоўная мэта дысцыпліны – фарміраванне гатоўнасці будучых спецыялістаў да асэнсаванага і мастацка-абгрунтаванага прымянення музычнага мастацтва ў эстрадных спектаклях і відовішчах. Дасягненне гэтай мэты ажыццяўляецца падчас рэалізацыі наступных *задач*:

– раскрыццё асаблівасцей музычнай драматургіі ў эстрадных відовішчах і сутнасці драматургічных функцый у ім;

– фарміраванне прадстаўленняў аб асноўных музычных паняццях, неабходных для ажыццяўлення музычна-пастановачнай дзейнасці;

– развіццё практычных навыкаў самастойнага вырашэння рэжысёрскіх задач сродкамі музычнай выразнасці;

– стымуляванне праяўлення асобасна-творчай індывідуальнасці і каштоўнасных адносін да музычнага мастацтва ў працэсе стварэння музычнай драматургіі відовішча;

– развіццё навыкаў ажыццяўлення музычна-рэжысёрскага аналізу твораў музычнага мастацтва.

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны ва ўзаемасувязі з іншымі дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў спецыялізаваную кампетэнцыю: выкарыстоўваць матэрыялы па музычнаму мастацтву для ўвасаблення рэжысёрскай ідэі адлюстравання нацыянальнага каларыту.

Працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацтва эстрады накіраваны на авалоданне студэнтамі ведамі і ўменнямі, якія дазволяць на высокім узроўні вырашаць прафесійныя задачы ў далейшай творчай і педагагічнай дзейнасці.

Выпускнік павінен *ведаць:*

– асноўныя музычна-тэарэтычныя паняцці;

– спецыфіку ўзаемадзеяння музыкі і эстраднага відовішча;

– асаблівасці музычнай драматургіі ў эстрадным спектаклі і драматургічныя функцыі музыкі ў ім;

– музычныя асновы гукарэжысуры;

– кампаненты музычна-рэжысёрскага аналізу твораў музычнага мастацтва;

– алгарытм музычнага афармлення эстраднага спектакля ці відовішча;

– структуру музычна-шумавой партытуры.

*умець:*

– здзяйсняць музычна-рэжысёрскі аналіз твораў музычнага мастацтва;

– ствараць музычную інсцэніроўку ці ілюстрацыю на аснове твораў іншых відаў мастацтва;

– прымяняць алгарытм музычнага афармлення эстраднага спектакля ці відовішча ў пастановачнай дзейнасці;

– праяўляць асобасна-творчую індывідуальнасць у працэсе стварэння музычнай драматургіі эстраднага спектакля ці відовішча.

*валодаць:*

– метадамі ўвасаблення рэжысёрскай ідэі для адлюстравання нацыянальнага каларыту;

– методыкай работы рэжысёра над музычнай часткай відовішча;

– тэхналогіяй пастаноўкі літаратурна-музычных кампазіцый.

Агульная колькасць гадзін па вучэбнай дысцыпліне “Музыка ў відовішчы” у адпаведнасці з вучэбным планам складае 102 гадзіны, з іх аўдыторных – 68: лекцыі – 10, практычныя заняткі – 50 гадзін, індывідуальных – 8. Веды і практычныя навыкі студэнтаў кантралююцца ў працэсе навучання (залік), а таксама пры арганізацыі пазааўдыторнай дзейнасці.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен. Працаемкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Прадмет, задачы і структура дысцыпліны «Музыка ў відовішчы». Роля дысцыпліны ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і яе сувязі са спецыяльнымі дысцыплінамі і дысцыплінамі гуманітарнага цыклу. Патрабаванні да ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў у музычнай падрыхтоўцы, неабходных спецыялісту ў галіне эстраднага мастацтва. Крытэрыі адзнакі дасягненняў студэнтаў у навучанні, метады і сродкі ацэньвання. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны.

## Тэма 1. Сувязь музыкі і відовішча: гістарычны аспект

Прынцыповыя асновы функцыянавання музыкі ў драматургіі тэатра і відовішча. Узаемадзеянне музыкі і эстраднага відовішча ў дзвух напрамках: музыка як мастацка-выразны сродак разам з выяўленчым мастацтвам, харэаграфіяй; музыка як структурны элемент відовішча (літаратурна-музычная кампазіцыя). Гісторыя музыкі ў тэатралізаваных відовішчах і святах.

## Тэма 2. Тыпалогія музычных твораў

Тыпы музычных твораў: фальклор (народная музыка), класічная музыка, эстрада і іх характарыстыкі. Стыль у музыцы. Музычныя жанры і іх характарыстыка (вакальныя і інструментальныя). Музычныя формы.

## Тэма 3. Драматургічныя функцыі музыцы ў відовішчах

Сюжэтная музыка і яе асаблівасці. Характарыстыка ўмоўнай музыцы. Тыпавыя віды музыкі (уверцюра, музычныя “антракты”, музычны фінал першага і другога дзеяння канцэрта ці відовішча, музычныя нумары ў ходзе сцэнічнага дзеяння). Віды музычных нумароў. Асноўныя віды музычных характарыстык. Драматургічныя сродкі музыкі: стварэнне атмасферы дзеяння, стварэнне нацыянальнага каларыту і каларыту эпохі, стварэнне характарыстыкі вобраза, дзеяння, характара і г.д.; выяўленне унутранага дзеяння і стану; абагульняючая, тэмпа-рытмічная; стварэнне лейтматываў; стварэнне кантраснасці і супастаўлення. Работа над шумавым афармленнем.

## Тэма 4. Сутнасць музычных ілюстрацый і тэхналогія яе стварэння

Азначэнне музычных ілюстрацыі. Разнастайныя віды музычных ілюстрацый: фрагменты музычных твораў (ці твора цалкам); музычныя ілюстрацыі як аснова дзеяння ў музычным суправаджэнні відовішчаў. Тэхналогія стварэння музычных ілюстрацый. Стварэнне музычных

ілюстрацый да твораў літаратуры, выяўленчага мастацтва, графікі, скульптуры.

**Тэма 5. Музычная інсцэніроўка і тэхналогія яе правядзення**

Паняцце музычнай інсцэніроўкі. Музычная інсцэніроўка як пастаноўка на сцэне фрагмента ці твора цалкам якога-небудзь з відаў мастацтва, што атрымала драматургічную распрацоўку ў форме пьесы ці сцэнарыя з уключэннем музычнага мастацтва ў працэс развіцця гэтага дзеяння. Інсцэніроўка твораў жывапісу, графікі, скульптуры, архітэктуры.

**Тэма 6. Структура музычна-шумавой партытуры і яе практычнае складанне**

Азначэнне музычнай партытуры. Характарыстыка музычна-шумавой партытуры ці гукавой партытуры эстраднага відовішча, што склалася ў практыцы рэжысёрскага мастацтва і яе структура. Стварэнне музычна-шумавога эпізоду, нумара, эстраднага відовішча. Гукавое суправаджэнне відовішча.

**Тэма 7. Методыка работы рэжысёра над музычнай часткай відовішча**

Музычна-рэжысёрскі аналіз відовішча. Методыка работы з музычным творам ва ўмовах розных форм драматургіі. Работа рэжысёра з кампазітарам, гукарэжысёрам.

**Тэма 8. Пастаноўка літаратурна-музычнай кампазіцыі**

Засваенне асноўных прынцыпаў пеўчай культуры: авалоданне дыханнем, гукавядзеннем. Работа над рэпертуарам – інтанацыяй, дыкцыяй, гукам у музычным творы. Стварэнне вобразу героя, рэжысуры нумара. Аб'яднанне асобных нумароў у адзіную літаратурна-музычную кампазіцыю. Мастацка-дэкаратыўнае і светавое афармленне відовішча.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | індывідуальныя | | |
| Уводзіны | 1 | | | | |
| *Тэма 1.* Сувязь музыкі і відовішча: гістарычны аспект | 1 | 4 | | | |
| *Тэма 2.* Тыпалогія музычных твораў | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 3.* Драматургічныя функцыі музыцы ў відовінчах | 2 | 4 | | | |
| *Тэма 4.* Сутнасць музычных ілюстрацый і тэхналогія яе стварэння | 2 | 4 | | | |
| *Тэма 5.* Музычная інсцэніроўка і тэхналогія яе правядзення | | 8 | | | |
| *Тэма 6.* Структура музычна-шумавой партытуры і яе практычнае складанне | 2 | 2 | | 6 | творчы праект |
| *Тэма 7.* Методыка работы рэжысёра над музычнай часткай відовішча | | 6 | | 4 | творчы праект |
| *Тэма 8.*Пастаноўка літаратурна-музычнай кампазіцыі | | 10 | 6 | 4 | творчы праект |
| **Усяго** | **8** | **40** | **6** | **14** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. Жукова, А. М., Овсянникова, О. А. Формирование музыкально-постановочной компетенции у режиссеров театрализованных представлений и праздников: монография / А. М. Жукова, О. А. Овсянникова. – Санкт-Петербург [и др.] : Москва : Лань, 2019. – 147 с.

2. Мордасов, А. А. Принципы режиссуры театрализованных представлений и праздников: учебное пособие / А. А. Мордасов. – Изд. 4-е, стереотипное. – Санкт-Петербург [и др.] : Лань, Планета музыки, 2020. – 125 с.

3. Фрумкин, Г. М. Сценарное мастерство: кино – телевидение – реклама: учебное пособие: для студентов, обучающихся по специальности 350700 — реклама: [для творческих специальностей] / Г. М. Фрумкин. – Москва : Академический проект, 2017. – 222 с.

4. Шароев, И. Г. Режиссура эстрады и массовых представлений: учебник / И. Г. Шароев. – 4-е изд., исправленное. – Москва : ГИТИС, 2014. – 339 с.

5. Шубина, И. Б. Драматургия и режиссура зрелищных форм. Соучастие в зрелище, или Игра в миф: учебно-методическое пособие / И. Б. Шубина. – Изд. 2-е, стереотипное. – Санкт-Петербург [и др.] : Лань, Планета музыки, 2018. – 238 с.

*Дадатковая*:

1. Гаранец, И. Н. Этапы работы над режиссерским сценарием театрализованного представления для детей: методическая разработка / И. Н. Гаранец. – Минск : Белорусская государственная академия музыки, 2018. – 45 с.

2. Купина, Н. А. Креативная стилистика: учебное пособие / Н. А. Купина. – Москва : Флинта, Наука, 2014. – 180 с.

3. Макарова, Е. А., Мойсейчук, С. Б., Смаргович, И. Л. Технологии культурно-досуговой деятельности: пособие для работников культуры / Е. А. Макарова, С. Б. Мойсейчук, И. Л. Смаргович. – Минск : Владимир Сивчиков, 2016. – 173 с.

4. Фишер, Дж., Кейс, Г. Голос. 99 упражнений для тренировки, развития и совершенствования вокальных навыков / Дж. Фишер, Г. Кейс ; пер. с англ. Д. Халиковой. – М. : Азбука Бизнес, Азбука-Аттикус, 2019. – 192 с.

5. Порт, М. Затмите всех! / М. Порт, пер. с англ. Л. Г. Третьяк. – Минск : Попурри, 2017. – 240 с.

## Рэкамендаваныя метады навучання

Матэрыял выкладаецца на аснове сучасных метадычных патрабаванняў з улікам узроўню ведаў студэнтаў. Пры чытанні лекцый асаблівая ўвага надаецца разгляду тэарэтычных асноў пошуку і даследавання неабходнай інфармацыі па тэме дысцыпліны і яе перапрацоўцы, практычнага прымянення атрыманых ведаў у вучэбнай дзейнасці і ў розных напрамках сферы культуры і мастацтва.

Практычныя заняткі накіраваны на фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў, выкарыстанне атрыманых тэарэтычных ведаў пры выкананні канкрэтных заданняў па тэматыцы навучальнай дысцыпліны. Методыка правядзення ўказаных заняткаў павінна садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей кожнага студэнта і набыццю навыкаў самастойнай работы. Варта прымяняць новыя формы арганізацыі працэсу навучання: візуалізаваныя лекцыі, выкарыстанне аўдыя- і відэаматэрыялаў, калектыўная практычная праца, дзейнасць у студыях гуказапісу і да т.п.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для выяўлення і выключэння прагалаў у ведах студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі:

– франтальнае апытанне на лекцыях, практычных занятках;

– абарона выкананых на практычных занятках работ;

– выкананне творчых заданняў і іх афармленне, якія прадугледжваюць самастойны выбар метаду рашэння задачы;

– кансультацыі і субяседванне.

Для вызначэння ступені адпаведнасці навучальных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендуецца выкарыстоўваць праектную дзейнасць, якая ўключае праблемныя, творчыя задачы, што дапускаюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

## Рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на ўзбагачэнне іх уменняў і навыкаў па вучэбнай дысцыпліне «Музыка ў відовішчы» ў вольны ад абавязковых вучэбных заняткаў час. Мэта самастойнай працы студэнтаў – садзейнічанне засваенню ў поўным аб’ёме зместу вучэбнай дысцыпліны праз сістэматызацыю, планаванне і кантроль уласнай дзейнасці, практычнае

ўвасабленне атрыманых ведаў. Выкладчык дае заданні па самастойнай рабоце і рэгулярна правярае іх выкананне.

Змест і формы самастойнай работы студэнтаў, якая кантралюецца, рэкамендуецца непасрэдна звязваць з выкарыстаннем метаду творчых праектаў, што дазваляе рэалізоўваць індывідуальны падыход да навучання. Падчас працы над праектамі студэнты лепш паглыбляюцца ў прадметную вобласць.

Такая арганізацыя работы садзейнічае развіццю прафесійнай кампетэнцыі.